

*Аляксандр Савуль*

# На ростанях

Бываюць ростані ў жыцці…
Шукаць дзе шчасце?
У які бок ісці?..
Бываюць ростані ў жыцці…

Вось Андрэй Лабановіч на скрыжаванні,
Настаўнік шукае свой шлях да асветы.
Сквозь цемру прабіцца да зорак, да рання,
Знайсці бы дарогу да сонца, да свету!

Міхал тут з Антосем гаворку вядуць:
"Зямля – вось аснова. Зямля нам не здрадзіць."
За праўдай у Вільню дарогі вядуць,
Бо шчасце ў працы – нам Колас парадзіць.

Сымонка са скрыпкай вандруе па свеце,
“А шчасце ў песні, вось божы дзе дар”.
А песні – музыкі любімыя дзеці,
Музыка над душамі ўсімі ўладар.

Сымонка з Аленкай ідуць за навукай,
Свет мудрасці кніжнай яны спасцігаюць.
Ім дружба, каханне – надзейнай парукай,
Задачы жыцця на дарозе рашаюць.

Кастусь вось маленькі на рэчцы зімою,
Бо дома хлопцу не сядзіцца…
Ён гэтай снежнаю парою
Адкрывае прыроды ўсе таямніцы.

Ядвіся, бы дзічка, глядзіць удалячынь…
І Ганна пячэ вось блінцы на сняданне…
І Грышку зацягвае Нёмана плынь…
І чуюцца песні дзяўчат аж да рання…

І я на ростанях стаю,
Сябе ў героях пазнаю…
Куды ісці? Дзе доля ляжа?
Любімы Колас мне падкажа.

## Адгалосак душы

Закрытыя школы – забытыя вёскі,
Дзіцячы тут смех паступова знікае…
Старыя хацінкі, гародаў палоскі…
Бабуля ўнукаў у госці чакае…

Стаіць у задуменні вялікі будынак,
Сумуе, глядзіць на яго Навіянка.
Мясцовыя дзеці бягуць на прыпынак,
Дырэктар былы прыязджае к нам ранкам.

Адгукаюцца болем і Лушчыкі мне:
Дом школьны пусты, нас не сустракае…
І зараз з дзяцей тут ніхто не жыве,
І вёска свой век ужо дажывае.

Пустымі аканіцамі глядзяць вокны-вочы,
Будынак стары ўвесь зарос, у траве,
А свільскія дзеці да аўтобуса крочаць,
Прыходзіцца ехаць у школу і мне…

Не ўбачым будынак мы болей ніколі:
Яго зруйнавалі і знаку няма...
І смех не пачуем ва Утканаўскай школе,
Ды толькі на сэрцы ў нас холад, зіма…

Закрытыя школы – забытыя вёскі…
Дзяцей усё меней, не чуецца смех…
Вітаюць былога яшчэ адгалоскі…
Сумуюць па школах забытыя вёскі…